ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 ЧЭРВЕНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15910)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імёны

## Вольга ЯКАВІШАНА:

# «ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

**Штодзённыя рэпетыцыі, яркія касцюмы, пастаянныя гастролі і, вядома ж, любоў публікі — менавіта такі графік жыцця гарманічны для нашай сённяшняй гераіні. Яна ўжо шмат гадоў працуе салісткай Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» і сёння падзеліцца з намі ўсімі сакрэтамі закулісся.**



***— Як вы прыйшлі ў ансамбль?***

— Знаёмства з «Харошкамі» адбылося яшчэ ў самым дзяцінстве. Калі была маленькай дзяўчынкай, мяне вельмі прыцягвалі народны танец і музыка. Я тады ўжо зразумела, што менавіта з гэтымі відамі творчасці хачу звязаць сваё жыццё. Убачыўшы маё жаданне і патэнцыял, мама запісала ў студыю пры ансамблі. У адзінаццаць гадоў я пачала там займацца. Шчыра кажучы, трапіць туды было не так ужо і проста. Для паступлення ў студыю мы здавалі экзамены: народны і класічны танец. Але нават калі вы скончылі яе, гэта не давала гарантыі аказацца ў «Харошках». Нашымі выкладчыкамі ў студыі былі высокаадукаваныя харэографы з багатым артыстычным досведам. Яны па-сапраўднаму заражалі нас сваімі талентам і імкненнем, мэтанакіравана навучалі любіць народны танец, а найлепшых выпускнікоў запрашалі ў калектыў. Калі ты старанна працуеш, горача жадаеш, і да гэтага дадаецца кропелька шанцавання... І вось ты ўжо артыст «Харошак»!

***— Цяжка было ўліцца ў калектыў?***

— У студыі я атрымала добрую прафесійную падрыхтоўку, без якой, на мой погляд, нельга стаць майстрам сваёй справы. Але ўсё адно напачатку было крыху не па сабе. У галаве ўвесь час круцілася, што мяне ўзялі на выпрабавальны тэрмін, і, нават прапрацаваўшы год у калектыве, я ўсё роўна часам думала, што мяне яшчэ правяраюць (*смяецца*).

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

SEX=БАЛЯСЫ

# У цэнтры — уВАГА!

**Ці ведалі вы, што, аказваецца, мужчыны з пузам самыя прывабныя для жанчын у бягучым годзе? («— Ты такая шчырая са мной. — З чаго ты ўзяў? — Ну дык ты ж жывот не ўцягваеш».) Прынамсі, гэта вынікае з апытання на адным з сайтаў знаёмстваў. У даследаванні ўзялі ўдзел дзве тысячы вольных жанчын, 75 працэнтаў з якіх хацелі б пачаць адносіны з мужчынам, чыя фігура ў сеціве атрымала назву Dad Bod («Татава цела»). Для такога целаскладу характэрныя адсутнасць рэльефу цягліц і наяўнасць лішняй вагі ў раёне жывата. («Вяду здаровы спосаб жыцця, а ён за мнойісці не хоча».) «Адзінокія людзі пачынаюць знаходзіць прывабнымі ўсё больш разнастайныя тыпы фігур, бо ведаюць, як цяжка трымаць сябе ў форме падчас пандэміі», — распавяла віцэ-прэзідэнт сайта знаёмстваў Марыя Саліван. («У краму «Заўтра зраблю» завезлі твой плоскі жывот і ўмацаваную «пятую кропку».)**



**Амерыканская спявачка LIZZO.**

А вось погляд з іншага боку. Поўная дзяўчына, журналістка Касандра Брэба, сустрэлася з худымі і падзялілася высновамі. Па яе словах, вопыт гэты быў пераважна няўдалы, аднак у выніку ёй удалося зразумець, якіх адносін да свайго цела яна чакае ад партнёраў. («— Любы, зрабі мне, калі ласка, бутэрбродзік. Толькі маленькі! — Зраблю, які атрымаецца. Сама абгрызеш да патрэбных памераў».)

Брэба паскардзілася, што мужчыны рэдка звярталі ўвагу на свае «худыя прывілеі». («Жонка — мужу: — Скажы, я тоўстая? — Не, вядома. Але я правільна разумею: скандал усё роўна будзе?») Для ілюстрацыі яна прывяла сітуацыю, якая адбылася ў метро: яе стройны партнёр змог праціснуцца праз натоўп і не падумаў, што ў яго поўнай сяброўкі гэта не атрымаецца. («Калі яна ўбачыла цану на сродак для пахудзення, бровы падняліся так, што складкі на жываце падцягнуліся самі па сабе».) З-за мноства падобных інцыдэнтаў Касандра расчаравалася ў худых людзях і нават пачала ігнараваць іх профілі ў дадатках для анлайн-знаёмстваў, аднак пазней змагла пераадолець крызіс і падзялілася некалькімі рэкамендацыямі. («Сёння скакала на вагах, пакуль стрэлка не ўтрамбавалася каля адзнакі ў 56 кілаграмаў».)

Дзяўчына параіла худым людзям, якія знаходзяцца ў адносінах з поўнымі, звяртаць больш увагі на іх патрэбы. Гэта дапаможа партнёрам адчуваць сябе ў бяспецы, сутыкнуўшыся з крытыкай іншых людзей. Аматарка анлайн-знаёмстваў адзначыла, што для яе важна ведаць, што партнёр на яе баку. («Найлепшая з дыет — гэта замужжа. Выйшла замуж — можна есці пасля шасці».) Касандра таксама парэкамендавала стройным людзям звярнуць увагу на свае перавагі і заняцца самаадукацыяй.

На думку Брэба, апошняе дапаможа ім зразумець, што кожны дзень перажываюць іх поўныя партнёры і які вопыт гэта фарміруе. («Яна сказала: «Ты быў пустой тратай маёй касметыкі».) Журналістка ўпэўненая, што сябры поўных людзей павінны заўсёды спыняць крытычныя выказванні ў іх адрас, нават калі іх партнёраў няма побач. Акрамя таго, на думку журналісткі, людзі з лішняй вагой маюць асаблівую патрэбу ў дотыках, таму што грамадства пастаянна крытыкуе іх цела і дае ім зразумець, што яны не выглядаюць жаданымі. («— Для жанчыны секс — найлепшае лякарства. — А калі не дапамагае? — Павялічце дозу».)

Ёсць і іншае стаўленне да вагі. Поўная гумарыстка з Аўстраліі Селеста Барбер спецыялізуецца на пародыях фатаграфій «зорак» і знакамітых манекеншчыц. («У мяне атрымалася не толькі захаваць сваю дзявоцкую фігуру, але і ўдвоіць яе».) З-за таго, што фігура ў жанчыны-коміка далёка не мадэльная, атрымліваецца смешна. («Прыгожая зграбная брунетка пазнаёміцца з сімпатычным маладым чалавекам. Мне 19 гадоў і 134 месяцы».) Апошняй «ахвярай» аўстралійкі стала брытанка Эфі Кэтнер. На арыгінальнай фатаграфіі тая пазіруе побач з аўтамабілем з адкрытым багажнікам. Дзяўчына ў мудрагелістым бікіні і панчохах элегантна закінула правую нагу на аўто. Селесце пра такую грацыю застаецца толькі марыць. (Аб'ява: «180 — 120 — 180. Шукаю работу па ўкладцы шпал. Інтым не прапаноўваць».)

Але, нягледзячы на ўсе адрозненні ад арыгінала, кадр гумарысткі выклікае нашмат больш эмоцый. («Здрада з клоўнам — і смех, і грэх».) Стоячы ў гольфах на аднойназе, жанчына ледзь захоўвае раўнавагу, але працягвае трымаць сур'ёзны твар. Дызайн бікіні таксама паўтораны «ідэальна». У версіі Барбер ён стаў белы, а чорныя стужкі замяніў скотч. За паўдня пост ацаніла больш за 300 тысяч чалавек. Зрэшты, нядаўні фотаздымак Селесты ў вобразе Бэлы Хадыд набраў больш за паўмільёна лайкаў. («У загсе прызначаюць дату вяселля на месяц наперад, каб нявеста магла пахудзець».)

Як і заўсёды, фанаты ў захапленні ад самаіроніі жанчыны. («Добры апетыт прыходзіць падчас ежы, а выдатны — падчас дыеты».) Іншыя заўважылі, што Барбер так налаўчылася ў сваіх работах, што са скотча цяпер можа «зляпіць» любое адзенне. Не трэба спыняцца на бікіні — лепш адразу рабіць цэлую калекцыю. («Мужчыны ўвесь час бегаюць або за «харошанькімі», або ад «страшненькіх».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ТАНЦА МНЕ ЗАЎСЁДЫ МАЛА»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**



***— А што наконт першага выступлення ў складзе «Харошак» прыгадаеце?***

— Гэты дзень дакладна запомніла на ўсё жыццё. Быў выязны канцэрт у маленькі гарадок. Я ўзрадавалася, бо сцэна там была не такой вялікай, як у Мінску. Але хваляванне ўсё роўна прысутнічала, ды яно і павінна заўсёды прысутнічаць у прафесійнага артыста незалежна ад працягласці яго сцэнічнай дзейнасці. Дасведчаныя артысты «Харошак» мяне ўсяляк падтрымлівалі.

На самай справе, у мяне тады былі змешаныя пачуцці: і хваляванне, і радасць, і гонар, што мае настаўнікі сталі маімі калегамі. І менавіта ў той дзень прыйшло ўсведамленне, што мара спраўдзілася — я стала артысткай «Харошак».



***— З якімі цяжкасцямі давялося сутыкнуцца на прафесійным шляху?***

— Прафесія артыста, мякка кажучы, нялёгкая. Я нават магу параўнаць з развіццём дзіцяці. У перыяд, пакуль чалавек становіцца майстрам у сваёй творчай сферы, ён праходзіць узлёты і падзенні, прыемныя моманты, а часам і вялікія цяжкасці. На жаль, без гэтага няпростага шляху немагчыма стаць артыстам. Першая цяжкасць, з якой я сутыкнулася на пачатку сваёй кар'еры і якая прысутнічае на працягу ўсёй дзейнасці танцора, — гэта барацьба з уласным целам. Ёсць такія людзі, у якіх прыродная гнуткасць і яны без асаблівай работы над сабой могуць займацца харэаграфіяй. Мне ж у гэтым плане не пашанцавала. Заўсёды прыходзілася ламаць сябе, працаваць, распрацоўваць новую сябе кожны дзень. Выдатныя педагогі дапамаглі развіць усе патрэбныя фізічныя якасці танцора. Менавіта за тыя любоў і душу, якія яны ўклалі ў мяне, я ім вельмі ўдзячная. Заўсёды з вялікай радасцю бягу на рэпетыцыі! Нават калі ты фізічна стомлены, душа ўсё роўна патрабуе танца. Ну і ў сувязі з пандэміяй зараз асноўнай цяжкасцю любой творчай прафесіі з'яўляецца адсутнасць гастроляў. Артысты моцна сумуюць па сваіх гледачах.

***— А што самае прыемнае ў вашай рабоце?***

— На гэта я магу адказаць нават не задумваючыся. Самае лепшае, што ёсць у прафесіі артыста, — гэта аддача гледача. Калі ў канцы выступлення ўся зала апладзіруе табе ў знак падзякі і ты бачыш у іх вачах радасць, то разумееш, што зрабіў сёння намнога больш, чым проста станцаваў. Ты падарыў тыя шчаслівыя эмоцыі, якімі будуць дзяліцца з навакольнымі. І атрымліваецца, што менавіта ты, артыст, зрабіў гэты свет крышачку ярчэйшым і больш радасным.

**«Самае лепшае, што ёсць у прафесіі артыста, — гэта аддача гледача».**

***— Напэўна, для гэтага трэба шмат працаваць?***

— Калі ты прафесійны артыст, то танец жыве ўнутры цябе заўсёды. Была б мая воля, я суткі праводзіла б у рэпетыцыйнай зале. На шчасце, у мяне выдатныя бацькі, якія цалкам падтрымліваюць і з радасцю сядзяць з маімі дзецьмі пры неабходнасці. Наогул, любая наша рэпетыцыя пачынаецца з урока класічнага танца. У ім спалучаецца не толькі грацыя рухаў, але і важнасць дакладнага паўтору ўсіх камбінацый. На мой погляд, гэта самы лепшы спосаб навучыць творчага чалавека вытрымцы і дысцыпліне. І толькі пасля гэтага ўрока мы ідзём альбо на аркестравую рэпетыцыю, альбо займаемся новай пастаноўкай. Многія думаюць, што танцоры ледзь не месяцамі вучаць новыя рухі. На самай справе гэта не так. Калі ты прафесіянал, для цябе вельмі лёгка вывучыць новую камбінацыю. Некаторыя танцоры падчас выступлення могуць перыферычным зрокам паглядзець на рухі партнёра і ў тую ж хвіліну паўтарыць іх так, што глядач ніколі не здагадаецца, што раней гэтую звязку артыст не ведаў. Гэта ўзровень сапраўднага прафесіянала.

***— У вас ёсць любімыя нумары?***

— Як і ў любога артыста. Але спачатку я хацела б патлумачыць, што «Харошкі» — гэта калектыў не толькі народнага танца. У ім вызначана нешта большае. Ён мае свой стыль, сваю стыхію і тыя асаблівасці, за якія публіка яго так любіць. І заслуга ў гэтым нашага мастацкага кіраўніка і аўтара пастановак Валянціны Іванаўны Гаявой. Яна стварае такія шэдэўры, якія немагчыма не палюбіць усім сэрцам. Дзякуючы ёй, у рэпертуары ансамбля і для кожнага артыста, і для кожнага гледача ёсць такі кірунак, які прыходзіцца яму да сэрца. Для мяне гэта нумары, у якіх раскрыта жаночая тэматыка, якую можна заўсёды станцаваць душой. Менавіта гэтыя творы раскрываюць гледачу патаемны ўнутраны свет жанчыны.

**Ангеліна НОВІКАВА,
студэнтка IV курса
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры
і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 9.06.2021 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ